**ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ**

**ЗАКОН ПРЫЦЯГНЕННЯ**

Адкрыў у прыродзе Ньютон
Сакрэты палётаў-падзенняў.
Я веру ў цудоўны закон
Узаемнага прыцягнення.

Да мора імкнецца рака,
І зорак зямля мая прагне,
І нават здалёку рука
Руку,
як магнітам,
прыцягне.

Нябачныя ўзнікнуць масты,
Ударыць гарачае рэха,
Я раптам адчую,
што ты
Прыехаў,
прыехаў,
прыехаў!

Не трэба тваіх тэлеграм.
У сэрцы няма ўжо сумнення,
Я веру:
ты з’явішся сам.
На тое –
закон прыцягнення!

*1970*